# «ЛЯХАВІЦКІ ВЕСНІК» – ГЭТА ТВОРЧЫ АСЯРОДАК

***Інтэрв'ю з Маргарытай Кухта,***
***галоўным рэдактарам раённай газеты «Ляхавіцкі веснік»***

*– Што для Вас газета, у якой Вы працуеце?*

– Лічу, што для мяне і маіх калег гэта магчымасць для творчасці, магчымасць данесці свае думкі, меркаванні, перакананні, ідэі да шырокай аўдыторыі.

Не сакрэт, што ў рэгіёнах раёнка – часцей за ўсё адзіны сродак, з якога атрымлівае мясцовую інфармацыю большасць насельніцтва. Такім чынам, гэта інструмент, дзякуючы якому журналісты дапамагаюць сваім падпісчыкам быць у курсе раённых, абласных, рэспубліканскіх (і не толькі) падзей.

Асабіста для мяне раённая газета «Ляхавіцкі веснік» – гэта творчы асяродак, які выхаваў мяне як журналіста, даў цікавую прастору для творчасці і развіцця, стаў пляцоўкай, дзе можна эксперыментаваць і самарэалізоўвацца.

*– Як мяняецца раённая (абласная) газета ў лічбавую эпоху?*

– Галоўнае, што яна мяняецца, імкнецца адказваць усім запытам часу. І ў плане дызайну, які з нумара ў нумар удасканальваецца, напаўняецца інфаграфікай; і адносна тэматычнага складніка, які становіцца больш арыентаваны на аналітыку, журналістыку меркаванняў і цікавых ідэй.

Сёння інтэрнэт-рэсурс і друкаванае выданне павінны працаваць адно на аднаго і ў выніку выдаць ідэальны медыяпрадукт. Для гэтага даводзіцца шукаць сродкі, якія б звязалі традыцыйны СМІ і інтэрнэт-рэсурс. Напрыклад, сёння ўвайшлі ў актыўнае выкарыстанне спецыяльныя сімвалы ў газеце, QR-коды і г. д.

*– Якія праблемы ёсць? Што Вы можаце вырашыць самі, а ў чым патрабуецца дапамога дзяржавы (дзяржаўных органаў)?*

– На жаль, адна з праблем раённых газет – падзенне тыражу. І ў вырашэнні гэтага пытання нашаму выданню (нават з улікам таго, што насычанасць на тысячу насельніцтва вельмі зайздросная – больш за 190) хацелася б больш разумення і падтрымкі з боку паштавікоў, аддзела ідэалагічнай работы, штатных ідэолагаў на прадпрыемствах і ў арганізацыях. На жаль, для іх пытанні падпіскі на раённае і іншыя выданні часта адыходзяць на апошні план. Мы шукаем і прапануем

новыя формы работы з насельніцтвам, калектывамі прадпрыемстваў і арганізацый і з гатоўнасцю адгукаемся на прапановы, ідэі чытачоў, падпісчыкаў, у тым ліку патэнцыяльных.

*– Якім Вам уяўляецца будучае Вашай газеты?*

– Упэўнена, традыцыйныя СМІ будуць заўсёды. Пытанне, як з цягам часу яны трансфармуюцца. Лічу, што рэгіянальнае выданне стане ў будучым унікальным СМІ на базе мясцовых матэрыялаў, у першую чаргу з аналітычнай афарбоўкай. І купляць або падпісваць выданне будуць тыя, хто хоча не толькі быць у курсе апошніх падзей, але і знайсці адказ ужо ў друкаваным выданні: якім чынам гэта адбылося, што стала перадумовай, што лічыць аўтар наконт гэтага. Нашай галоўнай мэтай стане магчымасць дапамагчы чытачу сфарміраваць сваё меркаванне на базе прачытанага, даць нагоду паразважаць.

## «ПОДСТРАИВАЕМСЯ ПОД ТРЕБОВАНИЯ СОВРЕМЕННОГО МИРА»

***Интервью с Маргаритой Кухта,***
***главным редактором районной газеты «Ляхавіцкі веснік»***

*– Трудно быть главным редактором газеты? Из чего состоит ваша работа?*

– Безусловно, трудно. А легко быть не может и не должно. Современная газета давно перестала быть просто печатным изданием, сегодня это мини-медиацентр, который объединяет традиционное издание и интернет-версию, а также аккаунты и группы в социальных сетях и мессенджерах. Поэтому каждый день редактора состоит из огромного количества задач, направленных на то, чтобы аудитория оперативно, достоверно получала информацию по разным каналам. А они, в свою очередь, учитывая интересы пользователей, должны быть уникальными и интересными.

*– Работа в интернете. Расскажите о своих медиаплатформах в сети: посещаемость, подписчики, проекты, планы. Как распределяется работа среди сотрудников?*

– Печатное издание должно работать на увеличение пользователей в социальных сетях и посетителей на сайте, а интернет-ресурс должен